Р. Г. Сущевский

# БЕЛАРУСКІ ВЕРСАЛЬ

10 студзеня 1598 г. "месца Рожаная" было набыта слонімскім старостам, затым канцлерам ВКЛ Львом Сапегам. Самыя першыя з ружанскіх запісаў адносяцца да 1602 г. У іх гаварылася аб будаўнічых працах без указання канкрэтнага месца. Запісы 1611 г. ускосна сведчаць аб завяршэнні работ па будаўніцтве палаца. Першапачаткова яго план быў падобны да плана палаца ў Ксенж-Велькі (Польшча), які быў узведзены ў 1585 – 1595 гг. майстрам з Фларэнцыі Санці Гучы. Існуе версія, што аўтарам першага Ружанскага палаца мог быць альбо сам Гучы, альбо яго вучань. Палац быў пабудаваны ў стылі італьянскага барока. Пасля смерці Льва Сапегі ў 1633 г. палац перайшоў да яго старэйшага сына Яна Станіслава. Але ў 1635 г. той памёр. Наступным уладальнікам стаў Казімір Леон – трэці сын Льва Сапегі. Да 1640-х гг. была праведзена перабудова палаца італьянцам Джавані Батыстам Джысліні. Палац стаў прадстаўляць сабой даволі шыкоўны будынак з рысамі барока. Ён меў 2 паверхі і быў крыжападобным у плане. Палац упрыгожвалі 3 вежы. У 1656 г. Казімір Леон памёр і Ружанскі палац перайшоў да яго далёкага сваяка і хрэсніка Паўла Яна Сапегі, ад якога ў 1665 г. яго малодшаму сыну Леону Базылю. Апошняму было толькі 5 гадоў, таму апекуном усёй маёмасці стала яго маці, а затым старэйшы брат Казімір Павел Ян, якому пасля смерці Леона Базыля ў 1686 г. перайшлі Ружаны. Вясной 1706 г. падчас Паўночнай вайны Ружанскія ўладанні былі спалены і спустошаны. Іх удалося выкупіць толькі ў 1714 г. Ежы Станіславу Сапегу. Пасля смерці апошняга распараджацца яго спадчынай стала другая жонка Тэадора з роду Перасвет-Солтан. 1746 г. яна аддала замуж сваю адзіную дачку Крысціну Розу за князя Казіміра Масальскага. У пасаг Крысціне былі аддадзены Ружаны. Маладыя ўзяліся за аднаўленне палаца, якое было завершана ў 1750-х гг. Будаўніцтва вялося па праекце каралеўскага архітэктара Яна Зыгмунта Дэйбля. Спадчыннікамі ўладанняў бяздзетных сваякоў з 1773 г. сталі Аляксандр і Магдалена Сапегі, пры гаспадаранні якіх пачалося адраджэнне Ружанскага палаца і саміх Ружан. Працы па перабудове выконваліся пад кіраўніцтвам прыдворнага архітэктара Сапегаў саксонца Яна Самуэля Бекера. З левага боку ад палаца быў пабудаваны тэатральна-манежны корпус. Быў закладзены падмурак карціннай галерэі. Усе будынкі вырашаліся ў стылі ранняга класіцызму. Паралельна палацу па восі сіметрычна была размешчана ўязная брама, якая злучала 2 двухпавярховыя жылыя флігелі для аховы і канцылярыі. Вароты мелі выгляд трыумфальнай аркі, у якой быў цэнтральны праезд і 2 бакавыя. Перад варотамі на пастаменце стаяла скульптура жанчыны, рука якой паказвала ў бок Бярозы Картузскай, дзе былі пахаваны Сапегі. Славіўся палац у Ружанах сваім паркам, які знаходзіўся на познач ад палаца. У парку былі купальня, грот, дом садоўніка, "двор Венеры", летні тэатр. Важным элементам парка былі вадаёмы. На старажытных валах былі ўзведзены каскадныя лесвічныя схілы. У пейзажную зону ўваходзіў звярынец у выглядзе прабітага прасекамі ляснога масіву. Ружанскі палац называюць "беларускім Версалем", бо яго планіроўка нагадвала французскі Версаль. Паступова Ружаны страцілі статус галоўнай рэзідэнцыі Сапегаў. На перабудову былі выдаткаваныя вельмі вялікія сродкі. Маёнтак набліжаўся да спусташэння. У 1786 г. па іроніі лёсу палацавы ансамбль выкарыстоўваўся пад ... суконную фабрыку. Работы па перабудове палаца ў Ружанах так і не былі завершаны. А пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 г. Аляксандр Сапега аддаў Ружанскі палац у арэнду прадпрымальніку Мордуху Пінесу. Гэту практыку працягвалі і наступныя ўладальнікі. Пасля паўстання 1830-1831 гг. усе зладанні Сапегаў былі адабраны ў расійскую казну і потым палац здаваўся ў арэнду пад ткацкую вытворчасць. У 1914 г. у выніку пажару, наўмысна выкліканага прачкай, згарэў галоўны і адзін з бакавых карпусоў. У 1930-х гг. палац быў часткова рэстаўраваны, а ў 1944 г. зноў абабраны фашыстамі. Яны ж спалілі і апошнюю невялікую ткачкую фабрыку. Пасля Вялікай Айчыннай вайны стан Ружанскага палаца доўгі час заставаўся гнятліва безнадзейным. Палац не аднаўляўся. Рэшткі палацавых сцен руйнаваліся. Летам 2008 г. на тэрыторыі палацавага комплексу пачаліся раскопкі і рэстаўрацыя. За 5 гадоз адрэстаўраваны заходні і ўсходні флігелі, плануецца ўзнаўленне паўднёвага корпуса палаца, дзе знаходзіліся тэатр і манеж. Тут размесцяцца гатэль і тэатр. Рэшткі збудаванняў будуць законсерваваныя.

1. http://be.wikipedia.org/wiki/Сапегі.
2. http://news.tut.by/society/216421.html

*Сущевский Роман Геннадьевич*, БГУИР, ФКП, ЭТТ, roma-chiter@mail.ru.
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна*, зав.кафедрой гуманитарных дисци- плин, к. и. н., доцент

Библиотека БГУИР